**БРЭСЦКІ АБЛАСНЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ УПРАЎЛЕННЕ АДУКАЦЫІ**
вул. Леніна, 11, 224006, г. Брэст
тэл.(факс) 21 85 91

**БРЕСТСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ УПРАВЛЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ**
ул. Ленина, 11, 224006, г. Брест
тел.(факс) 21 85 91

14.06.2016 № 04/66-22/05

На № ____________ ад ___________ г.Мінск

Шаноўная !

Ва ўпраўленні адукацыі Брэсцкага аблвыканкама разгледжаны Ваш зварот, які быў накіраваны ў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Паведамляем наступнае.

Згодна з артыкулам 90 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі асноўнымі мовамі навучання і выхавання ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляюцца дзяржаўныя мовы Рэспублікі Беларусь. Дзяржава гарантуе грамадзянам права выбару навучання і выхавання на адной з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь і стварае ўмовы для рэалізацыі гэтага права. Мова навучання і выхавання вызначаецца заснавальнікам установы адукацыі.

Івацэвіцкі раённы выканаўчы камітэт, як заснавальнік школы, вызначыў, што мовай навучання ў школе з'ўляецца беларуская мова. Гэты момант канкрэтна зафіксаваны ў Статуце школы, які зацверджаны рашэннем Івацэвіцкага раённага выканаўчага камітэта ад 27 жніўня 2014 года № 859. Навучанне ў школе на працягу існавання школы з 1965 года вядзецца на беларускай мове. Школа забяспечана падручнікамі і вучэбна-метадычнымі дапаможнікамі на беларускай мове ў поўным аб'ёме.

Адзначаем, што ніякіх ініцыятыў з боку аддзела адукацыі, спорту і турызму Івацэвіцкага выканаўчага камітэта і адміністрацыі школы аб пераводзе школы на рускую мову навучання не прадпрымалася і прадпрымацца не будзе. Зваротаў па пытанні пераводу школы на рускую мову навучання ні ва ўпраўленне адукацыі аблвыканкама, ні ў аддзел адукацыі, спорту і турызму Івацэвіцкага выканаўчага камітэта не паступала. Пытанне мовы навучання ў школе было разгледжана на педагагічным савеце (пратакол педагагічнага савета дзяржаўнай установы адукацыі "Гошчаўская сярэдняя школа" ад 5 мая 2016 года №6). Адміністрацыя і большасць настаўнікаў не падтрымлівае ідэю пераходу школы на рускую мову навучання. Большасць бацькоў сённяшніх навучэнцаў, а таксама бацькоў дзяцей, якія пойдуць у першы клас, таксама

жадаюць, каб школа была беларускамоўнай (пратакол бацькоўскага схода ад 14 мая 2016 года № 4).

Таксама паведамляем, што жыхарка вескі Гошчава Юлія Папко настаўніцай беларускай мовы ў школе не працуе, яе дзеці школу яшчэ не наведвалі, а толькі плануецца іх навучанне з 1 верасня 2016 года.

У выпадку нязгоды з вынікам разгляду звароту Вы маеце права абскардзіць яго ў парадку, вызначаным заканадаўствам.

Начальнік упраўлення Ю.М.Прасмыцкі

16. Чанава 21 84 61